Аддзел адукацыі, спорту і турызму Навагрудскага райвыканкама
ДУО “Пятрэвіцскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-школа”

# Ніколі не забудзем: унукі пра вайну

Рэспубліканскі конкурс, прысвечаны 70-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчынная вайне

**Аўтар работы:**
**Мантуш Павел, 11 гадоў, 6 клас**
**Гродзенская вобласць, Навагрудскі раён, аг. Пятрэвічы, вул. Маякоўскага, д. 56; тэл. 98-6-70**

**2014**

У маёй матулі ёсць невялікі архіў, у якім захоўваюцца сямейныя рэліквіі. Яго пачала збіраць яшчэ яе бабуля. Сярод гэтых рэліквій ёсць стары сямейны альбом з пажаўцелымі ад часу фотаздымкамі. З самага маленства я вельмі любіў разглядаць гэты альбом. Асабліва мяне цікавілі фотаздымкі ваенных часоў. Калі я пытаўся ў мамы: хто на гэтых фотаздымках, яна адказвала, што гэта мой прадзед, якім я магу ганарыцца. Калі я трошкі падрос, мама расказала мне пра яго.

З тых пор я не раз расказваў гісторыю жыцця майго прадзеда на школьных мерапрыемствах. Вось і цяпер, калі мне прапанавалі прыняць удзел у конкурсе "Ніколі не забудзем: унукі пра вайну", я адразу згадзіўся і прапаную вам вынікі сваёй працы.

Для майго прадзеда Івана Паўлавіча Грыня вайна пачалася так, як і для многіх жыхароў заходніх раёнаў. Цішыню летняга ранку парушыў гул варожых самалётаў, што ляцелі на ўсход. Камсамольцаў вёскі Навіны тэрмінова запрасілі ў сельскі Савет і даручылі неадкладна разнесці павесткі ваеннаабавязаным аб прызыве ў дзеючую армію.

Іван збіўся з ног. Ён бегаў з вёскі ў вёску, з хутара на хутар. А праз два-тры дні яму сказалі: "Немцы ідуць, трэба адступаць". Іван Грынь пагутарыў з адным, другім камсамольцам, і баявая сямёрка юнакоў рушыла на ўсход.

Па дарозе не раз бачыў, як чорныя самалёты з фашысцкай свастыкай скідвалі бомбы на бежанцаў, на навакольныя вёскі. Хутчэй бы атрымаць вінтоўку, уліцца ў рады воінаў, каб знішчыць забойцаў! Але такое шчасце для Івана Паўлавіча прадаставілася толькі глыбокай восенню 1941 года.

Калі юнаку паведамілі, у якую часць яго залічылі, то ў яго моцна зашчаміла сэрца. Сапёр, мінёр... Тут трэба вінтоўка, кулямёт, каб касіць праклятых фашыстаў. Але пажылы салдат супакоіў хлапца:

– Не хвалюйся, браце. Убачыш такое, што ўсё жыццё будзеш памятаць.

Хутка фронт. Немцы далёка прасунуліся на ўсход. Але пагналі іх ад Масквы, актывізавалася наступленне і крыху паўднёвей. Вось тут і пачаліся першыя баявыя будні для Івана Грыня. Уласна кажучы, не будні, а перш за ўсё начныя дзеянні. Для наступаючых войскаў трэба было ачышчаць праходы ад мін. Калі надыходзіў змрок, ціха крадучыся, на нейтральную паласу паўзлі сапёры, яны выяўлялі і абясшкоджвалі міны, каб даць праход для танкаў і пяхоты. Лёгка аб гэтым гаварыць, а як цяжка было рабіць. Як толькі фашысты прыкмячалі рух, адразу пярэдні край асвятляўся ракетамі, расцвечваўся рознакаляровымі трасарамі куль. Пачыналі біць мінамёты, артылерыя. І вось у гэтых умовах трэба было знаходзіць і абясшкоджваць міны. Іх было многа. На кожным кроку небяспека. Не так дакрануўся, не так ступіў – і смерць. Нездарма сярод салдат бытавала прымаўка: мінёр толькі раз памыляецца ў жыцці.

Ноччу ачышчаліся праходы, а як толькі наступаў ранак – пераможна біла наша артылерыя, хутка ішлі ў наступленне танкі, пяхота. Але і тут сапёрам не было адпачынку. Змучаныя, некаторыя раненыя, яны садзіліся на танкі і мчаліся ў праходы. Праціўнік біў па машынах. Нямала сяброў склала свае галовы на полі бітвы.

Быў у Івана Грыня такі момант, калі яго жыццё вісела на валаску. Ішоў ён па снезе і наступіў на скакучую міну. Яна падскочыла вышэй галавы і разарвалася. Цяжка растлумачыць, як застаўся чалавек жывым.

Ні днём , ні ноччу салдаты не ведалі адпачынку. Вызвалілі горад Бранск, а далей пайшла родная Беларусь. Добруш, Рэчыца, Калінкавічы, а потым украінскія гарады Оўруч, Сарны, Ковель і першы польскі горад Хэлм. Некалькі разоў быў ранены. Але не прасіўся юнак у шпіталь. Адляжаўся ў санітарнай часці – і зноў на пярэдні край.

У 1944 годзе Івана Паўлавіча прынялі ў рады партыі. У гэты час на яго грудзях ззялі медаль “За баявыя заслугі” і ордэн Чырвонай зоркі.

Пайшла польская зямля. Руіны і руіны. Сяржант бачыў босых дзяцей. Вымаў з зашмальцаванай торбы апошнія кавалкі цукру і даваў ім.

Баі на Вісле. Невялікі плацдарм ля Казімежа. Немцы вось-вось гатовы сапхнуць пехацінцаў у раку. Але зрабілі сваю справу сапёры. Яны густа расставілі міны. Крок – і фашысту смерць.

У абароне стаялі паўгода, а пасля пайшлі ў наступленне. І на гэты раз многа папрацавалі сапёры. Яны не толькі знялі свае міны, але зрабілі праходы ў нейтральнай паласе. Бой быў гарачы. Палыхаў вакол агонь, свісталі кулі, асколкі. І так да самага Берліна, а пасля да Эльбы.

Грудзі воіна ўпрыгожылі ўрадавыя ўзнагароды – два ордэны Чырвонай зоркі, ордэн Айчыннай вайны ІІ ступені, ордэн Славы ІІІ ступені, медалі “За баявыя заслугі”, “За вызваленне Варшавы”, “За ўзяцце Берліна”, “ За перамогу над Германіяй”.

Пасля вайны сапёрна-інжынерны батальён, у якім служыў Іван Паўлавіч, пераехаў на Каўказ. Тут былы воін пакахаў гараджанку Ганну Іванаўну. І хоць яна агітавала застацца ў вялікім горадзе, але яго пацягнула ў родныя мясціны. Сталі жыць у вёсцы Лаўцы. Спачатку Іван Паўлавіч працаваў дырэктарам цагельнага завода, затым старшынёй сельскага Савета, а потым дзесяць гадоў старшынёй узбуйненага калгаса. Па стану здароўя папрасіўся на лягчэйшую работу і ўзначаліў будаўнічую брыгаду ў калгасе імя Маякоўскага.

За працоўныя заслугі мой прадзед Грынь Іван Паўлавіч быў дэлегатам ІІІ Усесаюзнага з’езда калгаснікаў, падчас якога займаў месца ў Прэзідыуме з’езда. А яшчэ мой прадзед быў у Маскве на Усесаюзнай выставе дасягненняў народнай гаспадаркі. Пра майго прадзеда напісана і ў раённай кнізе “Памяць”, а яго асабістыя рэчы захоўваюцца ў школьным музеі.

Хіба ж я не магу ганарыцца такім прадзедам?!

**Дадатак**

## І.П. Грынь са сваімі баявымі таварышамі


І.П. Грынь у цэнтры


І.П. Грынь злева


І.П. Грынь у цэнтры


Фарсіраванне р. Одэр  І.П. Грынь з вяслом


І.П. Грынь у цэнтры


І.П. Грынь уверсе ў цэнтры



На грудзях І.П. Грыня – яго баявыя узнагароды




Чырвонаармейская кніжка байца І.П. Грыня

## Галоўныя узнагароды І.П. Грыня




Ордэн Айчыннай вайны II ступені




Медаль Жукава




Ордэн Славы III ступені

## Удзел І.П. Грыня ў грамадскім жыцці

І.П. Грынь – дэлегат і член Прэзідыума ІІІ Усесаюзнага з’езда калгаснікаў. 25-27 лістапада 1969 года.



Москва. Кремлевский Дворец съездов. 25 ноября 1969 года. В президиуме III Всесоюзного съезда колхозников. Фото В. Воронина и А. Пахомова.

ТРЕТЬЕМУ ВСЕСОЮЗНОМУ СЪЕЗДУ КОЛХОЗНИКОВ



ПРЕЗИДИУМ СЪЕЗДА

| | | |
|---|---|---|
| 1. Брежнев Л. И. | 33. Зарубин В. А. | 65. Наразов Х. |
| 2. Воронов Г. И. | 34. Золотухин Г. С. | 66. Низовских Е. К. |
| 3. Кириленко А. П. | 35. Иванюта А. Л. | 67. Никитин В. А. |
| 4. Косыгин А. Н. | 36. Издикулова Р. | 68. Нилова Е. И. |
| 5. Мазуров К. Т. | 37. Кавун В. М. | 69. Овезов Б. |
| 6. Пельше А. Я. | 38. Калачик В. М. | 70. Пономарев Б. Н. |
| 7. Подгорный Н. В. | 39. Капитонов И. В. | 71. Посмитный М. А. |
| 8. Полянский Д. С. | 40. Катушев К. Ф. | 72. Пульникова С. С. |
| 9. Суслов М. А. | 41. Каулиньш Э. М. | 73. Расулов Д. |
| 10. Шелепин А. Н. | 42. Келдыш М. В. | 74. Рашидов Ш. Р. |
| 11. Шелест П. Е. | 43. Клепиков М. И. | 75. Савченко М. Х. |
| 12. Авакян Р. В. | 44. Коваленко А. В. | 76. Сизов Г. Ф. |
| 13. Алиев Г. А. | 45. Конотоп В. И. | 77. Снечкус А. Ю. |
| 14. Андропов Ю. В. | 46. Кочинян А. Е. | 78. Соломенцев М. С. |
| 15. Аретагин Г. А. | 47. Красников И. Г. | 79. Ступников М. М. |
| 16. Ахунова Т. | 48. Кулаков Ф. Д. | 80. Табеев Ф. А. |
| 17. Бадон О. Л. | 49 Кунаев Д. А. | 81. Тимашева М. Ф. |
| 18. Бодюл И. И. | 50. Купуниа Т. А. | 82. Тихомирова Л. А. |
| 19. Боднарь А. И. | 51. Курбанов А. А. | 83. Тээ Э. Я. |
| 20. Булавин Е. М. | 52. Кэбин И. Г. | 84. Тяжельников Е. М. |
| 21. Булат И. М. | 53. Левенец М. И. | 85. Усов П. М. |
| 22. Выштак С. Д. | 54. Лобанов П. П. | 86. Устинов Д. Ф. |
| 23. Восс А. Э. | 55. Лобов А. Ф. | 87. Усубалиев Т. |
| 24. Гармаш Д. М. | 56. Мадаминов Р. | 88. Форманюк А. М. |
| 25. Георгиев А. В. | 57. Малинина П. А. | 89. Черников Г. Т. |
| 26. Гиталов А. В. | 58. Мальцев Т. С. | 90. Шакиров М. З. |
| 27. Горшков А. В. | 59. Маркина Л. И. | 91. Шолохов М. А. |
| 28. Горячев Ф. С. | 60. Матвейчук И. Е. | 92. Шопокова К. |
| 29. Гринь И. П. | 61. Мацкевич В. В. | 93. Шяулене М. В. |
| 30. Гришин В. В. | 62. Машеров П. М. | 94. Щербицкий В. В. |
| 31. Демичев П. Н. | 63. Мжаванадзе В. П. | 95. Эрсарыев О. |
| 32. Демченко М. С. | 64. Могильченко Г. С. | 96. Яснов М. А. |

Состав секретариата, мандатной и редакционной комиссий съезда публикуется на 5-й странице.



Фотаздымкі з газеты “ПРАВДА” ад 26 лістапада 1969 года.



III Усесаюзны з’езд калгаснікаў.
Масква, Крэмль, 25-27 лістапада 1969 года.
І.П. Грынь – 2-гі злева ў другім радзе зверху.




Усесаюзная выстава дасягненняў народнай гаспадаркі. Масква, 1954 год.
І.П. Грынь – 4-ты справа.



І.П. Грынь – старшыня калгаса імя Маякоўскага



І.П. Грынь (1-шы злева) сярод ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, 1987 год

 

Элементы экспазіцыі школьнага музея: асабістыя рэчы І.П. Грыня